*Рэдакцыйная калегія часопіса «Бібліятэчны свет» шчыра віншуе* ***Гігіна Вадзіма Францавіча*** *з прызначэннем на пасаду генеральнага дырэктара Нацыянальнай бібліятэкі Беларусі.*

*Жадаем плёну ў працы, поспехаў і дабрабыту!*



**МІНІСТЭРСТВА КУЛЬТУРЫ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ** | **МИНИСТЕРСТВО КУЛЬТУРЫ РЕСПУБЛИКИ БЕЛАРУСЬ**

**ЗАГАД** | **ПРИКАЗ**

26.05.2023 № 118

г. Мінск | г. Минск

Аб выніках XXXI Рэспубліканскага конкурсу «Бібліятэка – асяродак нацыянальнай культуры»

На падставе пункта 18 Інструкцыі аб парадку правядзення рэспубліканскага конкурсу «Бібліятэка – асяродак нацыянальнай культуры», зацверджанай пастановай Міністэрства культуры Рэспублікі Беларусь ад 26 снежня 2007 г. № 52, і пратакола пасяджэння журы XXXI Рэспубліканскага конкурсу «Бібліятэка – асяродак нацыянальнай культуры» ад 14 красавіка 2023 г. № 1,

ЗАГАДВАЮ:

1. Узнагародзіць пераможцаў XXXI Рэспубліканскага конкурсу «Бібліятэка – асяродак нацыянальнай культуры» (далей – конкурс):

1.1. у намінацыі **«За значны ўклад у выхаваўчую работу з падрастаючым пакаленнем»**:

1.1.1. дыпломамі першай ступені і грашовымі прэміямі ў памеры 50 базавых велічынь:

Навагрудскую бібліятэку сямейнага чытання – філіял дзяржаўнай установы культуры «Навагрудская раённая бібліятэка» Гродзенскай вобласці;

Александрыйскую сельскую бібліятэку дзяржаўнай установы культуры «Цэнтралізаваная бібліятэчная сетка Шклоўскага раёна» Магілёўскай вобласці;

1.1.2. дыпломамі другой ступені і грашовымі прэміямі ў памеры 40 базавых велічынь:

дзяржаўную ўстанову культуры «Любанская раённая цэнтральная бібліятэка імя І.А. Муравейкі» Мінскай вобласці;

філіял «Якімаваслабадская сельская бібліятэка» дзяржаўнай установы культуры «Светлагорская раённая сетка бібліятэк» Гомельскай вобласці;

1.1.3. дыпломамі трэцяй ступені і грашовымі прэміямі ў памеры 30 базавых велічынь:

філіял «Гарадская дзіцячая бібліятэка імя А.П. Гайдара» дзяржаўнай установы культуры «Рэчыцкая раённая сетка бібліятэк» Гомельскай вобласці;

Гарадзішчанскую гарпасялковую бібліятэку дзяржаўнай установы культуры «Баранавіцкая раённая цэнтралізаваная бібліятэчная сістэма» Брэсцкай вобласці;

1.2. у намінацыі **«За навацыі ў галіне бібліятэчнай справы»**:

1.2.1. дыпломамі першай ступені і грашовымі прэміямі ў памеры 50 базавых велічынь:

дзіцячую бібліятэку-філіял імя А.С. Пушкіна ўстановы культуры «Цэнтралізаваная сістэма дзяржаўных публічных бібліятэк г. Магілёва»;

Сасноўскую сельскую бібліятэку-клуб дзяржаўнай установы культуры «Смаргонская раённая бібліятэка» Гродзенскай вобласці;

1.2.2. дыпломам другой ступені і грашовай прэміяй у памеры 40 базавых велічынь:

Жабінкаўскую цэнтральную раённую бібліятэку дзяржаўнай установы культуры «Жабінкаўская раённая цэнтралізаваная бібліятэчная сістэма» Брэсцкай вобласці;

1.2.3. дыпломам трэцяй ступені і грашовай прэміяй у памеры 30 базавых велічынь:

дзяржаўную ўстанову культуры «Лоеўская цэнтральная раённая бібліятэка» Гомельскай вобласці;

1.3. у намінацыі **«За пошукавую і даследчую працу»**:

1.3.1. дыпломамі першай ступені і грашовымі прэміямі ў памеры 50 базавых велічынь:

Гродзенскую гарадскую цэнтральную бібліятэку імя А. Макаёнка дзяржаўнай установы культуры «Цэнтралізаваная бібліятэчная сістэма г. Гродна»;

Сасноўскую сельскую бібліятэку дзяржаўнай установы культуры «Віцебская раённая цэнтралізаваная бібліятэчная сістэма» Віцебскай вобласці;

1.3.2. дыпломамі другой ступені і грашовымі прэміямі ў памеры 40 базавых велічынь:

Краснапольскую цэнтральную раённую бібліятэку імя М. Ткачова дзяржаўнай установы культуры «Цэнтралізаваная бібліятэчная сістэма Краснапольскага раёна» Магілёўскай вобласці;

Вялікасельскую бібліятэку дзяржаўнай установы культуры «Свіслацкая раённая бібліятэка» Гродзенскай вобласці;

1.3.3. дыпломамі трэцяй ступені і грашовымі прэміямі ў памеры 30 базавых велічынь:

дзяржаўную ўстанову культуры «Уздзенская цэнтральная раённая бібліятэка імя Паўлюка Труса» Мінскай вобласці;

Заастравецкую сельскую бібліятэку дзяржаўнай установы культуры «Клецкая раённая цэнтральная бібліятэка» Мінскай вобласці;

1.4. у намінацыі **«За падтрымку і развіццё чытання»**:

1.4.1. дыпломамі першай ступені і грашовымі прэміямі ў памеры 50 базавых велічынь:

дзяржаўную ўстанову культуры «Астравецкая раённая бібліятэка» Гродзенскай вобласці;

Елкаўскую сельскую бібліятэку дзяржаўнай установы культуры «Зэльвенская раённая бібліятэка» Гродзенскай вобласці;

1.4.2. дыпломамі другой ступені і грашовымі прэміямі ў памеры 40 базавых велічынь:

Цэнтральную бібліятэку імя Янкі Купалы дзяржаўнай установы «Цэнтралізаваная сістэма дзяржаўных публічных бібліятэк г. Мінска»;

Сакалоўскую сельскую бібліятэку дзяржаўнай установы культуры «Бярозаўская раённая бібліятэчная сістэма» Брэсцкай вобласці;

1.4.3. дыпломамі трэцяй ступені і грашовай прэміяй у памеры 30 базавых велічынь:

дзяржаўную ўстанову культуры «Брэсцкая цэнтральная гарадская бібліятэка імя А.С. Пушкіна» Брэсцкай вобласці;

Макранскую сельскую бібліятэку дзяржаўнай установы культуры «Цэнтралізаваная бібліятэчная сетка Быхаўскага раёна» Магілёўскай вобласці.

2. Прысудзіць удзельнікам рэспубліканскага этапа конкурсу заахвочвальныя грашовыя прэміі ў памеры 10 базавых велічынь:

Цэнтральнай бібліятэцы імя У. Маякоўскага дзяржаўнай установы культуры «Цэнтралізаваная бібліятэчная сістэма г. Наваполацка» Віцебскай вобласці;

Пінскай гарадской дзіцячай бібліятэцы імя Якуба Коласа дзяржаўнай установы культуры «Пінская гарадская цэнтралізаваная бібліятэчная сістэма» Брэсцкай вобласці;

Верхнядзвінскай цэнтральнай раённай бібліятэцы імя Тараса Хадкевіча дзяржаўнай установы культуры «Верхнядзвінская цэнтралізаваная бібліятэчная сістэма» Віцебскай вобласці;

Старарудня́нскай сельскай бібліятэцы дзяржаўнай установы культуры «Жлобінская цэнтральная раённая бібліятэка імя Н.К. Крупскай» Гомельскай вобласці.

3. Дзяржаўнай установе «Нацыянальная бібліятэка Беларусі» забяспечыць выплату грашовых прэмій названым бібліятэкам у пунктах 1 і 2 гэтага загада за кошт сродкаў, прадугледжаных Міністэрству культуры на правядзенне цэнтралізаваных культурных мерапрыемстваў Дзяржаўнай праграмы «Культура Беларусі» на 2021–2025 гг. (падпраграма «Мастацтва і творчасць»).

Міністр А.М.Маркевіч